перагаворы, у прыватнасці ў кіраўнікоў самага рознага рангу, з'яўляецца сур'ёзным прабелам у іх прафесійнай падрыхтоўцы і эканамічна абыходзіцца значна даражэй, чым выдаткі на навучанне ў гэтым напрамку. Так, у вядомага амерыканскага даследчыка Дэйлі Карнэгі мы знаходзім наступныя даныя: каля 15% фінансавага поспеху, якога дасягнуў спецыяліст, варта аднесці на кошт чыста тэхнічных ведаў, астатнія 85% - на кошт яго мастацтва ў чалавечай інжынерыі.

4. Слова, рыторыка, моўнае мастацтва былі на службе камуністычнай ідэалогіі, таталітарна-бальшавіцкай сістэмы, якая адышла ў нябыт, і з'яўляліся па сутнасці кіраўніцка-рэпрэсіўным інструментам. Сёння ж слова заклікана выканаць прама супрацьлеглую задачу - вучыць чалавека самога кіраваць сабой.

Кожны чалавек імкнецца выказаць свае думкі як мага больш дакладна і выразна. Гэта неабходна і выкладчыкам універсітэта культуры, і яго выхаванцам. Авалоданне прафесійнай лексікай, мастацтвам дзелавых зносін складае аснову сучаснага тыпу выкладчыка, кіраўніка, з'яўляецца адным з галоўных кампанентаў іх навукова-прафесійнай і дзелавой кампетэнтнасці і актыўнасці.

Каралёў М.М.,
канд.пед.навук,
ст.выкладчык

## ПЕРАХОД НА ШМАТУЗРОЎНЕВУЮ ПАДРЫХТОЎКУ КІРУЮЧЫХ КАДРАЎ У СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

Пераход на шматузроўневую сістэму адукацыі патрабуе карэннага перагляду зместу і сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай адукацыі.

У заходніх краінах вылучаюць 3 асноўныя этапы вышэйшай адукацыі.

1 этап - 3-4 гады (па асобных спецыяльнасцях болей). Ён заканчваецца прысваеннем адпаведнай ступені бакалаўра (у ЗША, Англіі, Аўстраліі, Японіі), мэтрыз (у Францыі), лісанс (у Бельгіі) або выдачай адпаведнага дыплома (сертыфіката) аб вышэйшай адукацыі.

На другую ступень вышэйшай адукацыі з ліку выпускнікоў першага этапа непасрэдна паступаюць у сярэднім 10-25% (напрыклад, у Аўстраліі - 7%, у Аўстрыі - 10%, у Англіі - 15%, у ЗША - каля 20%, у Японіі - 6%). Гэты этап вышэйшай адукацыі дае ў асноўным агульную фундаментальную (напрыклад, у Англіі, Іспаніі, меней у ЗША) неспецыялізаваную падрыхтоўку ў выбраным напрамку, у другіх дзяржавах (ФРГ, Бельгія, Францыя) выпускнікі гэтага этапа маюць болей мэтанакіраваную падрыхтоўку. Але амаль ва ўсіх выпадках выпускнікі першага этапа яшчэ не лічацца самастойнымі спецыялістамі вузкага профілю, і для атрымання гэтага статуса ім неабходна навучанне на другім этапе адукацыі. Гэта могуць быць таксама адпаведныя 1-2 гадзічныя спецыялізаваныя курсы з улікам спецыфікі канкрэтнай працы або адпаведных кваліфікацыйных экзаменаў па спецыяльнасці пасля 1-3 гадоў практычнай работы.

Другі этап вышэйшай адукацыі на працягу 1-2 гадоў накіраваны на атрыманне ступені магістра (ЗША, Англія, Аўстрыя, Японія), ці дыплома паглыбленага навучання (Францыя), ці спецыяльнага дыплома лісанс (Бельгія). Як правіла, навучанне на гэтым этапе ажыццяўляецца па індывідуальных праграмах, распрацаваных студэнтамі разам з навуковым кіраўніком і зацверджаных кафедрай (дэканатам).

У большасці выпадкаў гэты этап разглядаецца як неабходная ступень для далейшай адукацыі з мэтай падрыхтоўкі доктарскай дысертацыі.

Трэці этап вышэйшай адукацыі практычна ўсюды на Захадзе з'яўляецца навучаннем у дактарантуры (накштальт нашай аспірантуры) для падрыхтоўкі доктарскай дысертацыі. Паступаць у дактарантуру можна як пасля другога этапа (тэрмін навучання 1-3 гады ў залежнасці ад спецыяльнасці), так і пасля заканчэння першага этапа навучання, і тады тэрмін навучання ў дактарантуры можа працягвацца ад 3 да 5 гадоў.

Пры пераходзе да падрыхтоўкі мэнеджэраў сацыякультурнай сферы па шматузроўневай сістэме трэба ўлічваць як станоўчыя, так і адмоўныя вынікі замежнага вопыту. На наш погляд, больш падыходзіць для нас вопыт Германіі ў падрыхтоўцы спецыялістаў.

На першым узроўні (3,5 г.) студэнт вывучае асноўныя агульнагуманітарныя і агульнапрафесійныя прадметы, здае адпаведныя экзамены, што дае падставу для атрымання ступені бакалаўра культуралогіі і кваліфікацыі мэнеджэра сацыякультурнай сферы. Для таго, каб атрымаць вузкую кваліфікацыю (мэнеджэр кіно, мэнеджэр

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у сферы турызму, мэнеджэр канцэртна-відовішчных праграм і г.д.) выпускніку I этапа належыць прайсці адпаведныя аднагадзічныя спецыялізаваныя курсы з улікам працаўладкавання ці здаць адпаведныя кваліфікацыйныя экзамены па спецыялізацыі пасля 1-3 гадоў практычнай дзейнасці.

На другім этапе (1.5 г.) лепшыя выпускнікі першага этапа праходзяць агульнакультуралагічную падрыхтоўку на ступень магістра культуралогіі і прафесійную па індывідуальных праграмах. Пасля выканання пісьмовай работы (дыплома) ім прысвойваюцца кваліфікацыі ў адпаведнасці з праграмай навучання, напрыклад:

- мэнеджэр-эканаміст сацыякультурнай сферы;
- мэнеджэр-сацыёлаг сацыякультурнай сферы;
- мэнеджэр-эколаг сацыякультурнай сферы;
- мэнеджэр-праграміст сацыякультурнай сферы;
- мэнеджэр-прававед сацыякультурнай сферы;
- мэнеджэр па знешнекультурных сувязях;
- мэнеджэр па рэкламнай дзейнасці і г.д.

Пры пераходзе на шматузроўневую сістэму адукацыі ўзнікне неабходнасць перагляду вучэбных планаў, напрыклад перанясенне часткі прадметаў культуралагічнага цыкла на другі этап у аб'ёме, неабходным для атрымання ступені магістра культуралогіі, і, наадварот, пашырэнне зместу прадметаў агульнапрафесійнай накіраванасці на першым узроўні для атрымання кваліфікацыі мэнеджэр сацыякультурнай сферы.

У блізкім часе будзе неабходным і адмаўленне ад патокаў навучання ў сувязі з далейшым пашырэннем ролі і значэння спецыялізацый.

Варашылаў А.К.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## ЗАДАЧЫ ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ СВЯДОМАСЦІ САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА РАБОТНІКА

Сучасная сацыякультурная сітуацыя характарызуецца працэсам пераходу да рынку і маркетынгу культурных паслуг. Адміністрацыйна-каманднае, бюракратычнае кіраўніцтва развіццём культуры паступова адыходзіць, хоць яго механізм яшчэ не зломлены да канца і працягвае ўплываць на сацыякультурныя працэсы. У гэтай сітуацыі падрыхтоўка спецыялістаў патрабуе вырашэння складаных праблем і пошуку новых нестандартных падыходаў.

Фарміраванне прафесійнай свядомасці сацыякультурнага работніка складаецца з двюх узаемазвязаных задач навучання:

1) узмацненне яго эканамічнай, кіраўніцкай падрыхтоўкі;

2) авалоданне тэхналогіяй кіравання развіццём сацыякультурнай дзейнасці асобы ў сферы вольнага часу.

Імкненне ВНУ культуры рыхтаваць спецыялістаў з акцэнтам на адным з гэтых кампанентаў не дае магчымасці сфарміраваць у іх цэласнае ўяўленне аб прафесійнай дзейнасці. Атрымліваецца так, што навучанне мэнеджэра сацыякультурнай сферы зводзіцца да падрыхтоўкі кіраўніка-адміністратара або падрыхтоўкі сацыяльнага работніка, які не ўмее абгрунтаваць і падвесці юрыдычную і эканамічную базу пад сваю дзейнасць. На наш погляд, сацыякультурны работнік гэта не толькі кіраўнік-адміністратар, што працуе ў "гушчы папер", а ў першую чаргу кіраўнік-педагог, які працуе ў "гушчы людзей", валодае ўменнямі і навыкамі кіравання развіццём асобы ў сферы вольнага часу.

Ва ўмовах пераходу да рынку сацыякультурны работнік можа ствараць "тавар", які будзе карыстацца попытам. Такім прадуктам можа быць яго арганізатарская дзейнасць, распрацоўка і пастаноўка сцэнарыяў розных форм, мерапрыемстваў, распрацоўка праграм (рэгіянальных, культурна-творчых і інш.) сацыякультурнага развіцця рэгіёна, супольнасці, групы, калектыву і асобнага чалавека. Вытворчасць такога "тавару" патрабуе спецыяльных ведаў, уменняў і дасканалага вывучэння самога чалавека, спецыфічных заканамернасцей і мадэлей паводзін пры арганізацыі вольнага часу ў сацыякультурнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ